**В. Г. Кнорын**

# Нататкі аб аграрнай рэвалюцыі на Беларусі

Барацьба сялян за зямлю зьяўляецца адным з найбольш важных пытаньняў перадкастрычнікавага пэрыяду на Беларусі. Аднак, у нашай юбілейнай літаратуры да 10-годзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі гэтаму пытаньню надаецца вельмі мала ўвагі. Гісторыя аграрнага руху і сялянскага паўстаньня на Беларусі яшчэ ня вывучана, больш таго, нават не распачата яе вывучэньне і не сабраны архіўныя матар'ялы. Тым, хто ня прымаў непасрэднага ўдзелу ў гэтым руху, у большасьці выпадкаў, вядомы толькі асобныя гераічныя эпізоды і асобныя факты, але гэты прабел павінен быць запоўнены. Нашы навучальна-дасьледчыя арганізацыі павінны паставіць аднэй з сваіх важнейшых задач збор матар'ялаў па гісторыі сялянскага паўстаньня і аграрнай рэвалюцыі, без вывучэньня якіх ня можа быць зразумелай гісторыя Кастрычніка і гісторыя 3-гадовай пасьлякастрычнікавай барацьбы за ўладу саветаў на Беларусі. Без вывучэньня гісторыі сялянскага паўстаньня і аграрнай рэвалюцыі таксама ня можа быць напісана гісторыя бальшавізму на Беларусі, ня можа быць зразумелы палітычны саюз рэвалюцыйнага пралетарыяту і сялянства супроць абшарнікаў і той выключны ўплыў, якім бальшавікі карысталіся ў кастрычнікавыя дні і карыстаюцца да гэтай пары ў шырокіх сялянскіх масах Беларусі.

Па сіле і размаху аграрнага руху, у пэрыяд ад Лютага да кастрычніка, поруч з Паволжжам і Цэнтральнай Чорназёмнай вобласьцю, Беларусь займае адно з першых месц. Вострае малазямельле, пры згрупаваньні ў руках абшарнікаў вялізных латыфундый, фэадальныя перажыткі, якія захаваліся, ня гледзячы на шпаркі рост капіталістычных элемэнтаў у сельскай гаспадарцы, зьяўляліся асноўнай прычынай, абвастраючай барацьбу сялян супроць абшарнікаў і абшарніцкага земляўладаньня. Наяўнасьць фронту давала сялянскаму руху рэвалюцыйныя кадры. Моцная бальшавіцкая арганізацыя сваечасова пачала барацьбу з эсэраўскімі імкненьнямі затрымаць сялянскі рух і, перамагаючы эсэраўскі апартунізм, накіроўвала рух у рэвалюцыйную логву.

Аграрны рух на Беларусі пачаўся, як шырокі неарганізаваны рух сялянскіх масаў, зараз-жа пасьля Лютаўскай рэвалюцыі. Сяляне скарысталіся зьменай улады для таго, каб зараз-жа паставіць пытаньне аб зямлі і вырашыць яго ў духу поглядаў, якія ўстанавіліся ў шырокіх сялянскіх масах ужо даўно. Ужо праз два тыдні пасьля перавароту ў Петраградзе, Магілеўскі губэрскі камісар часовага ўраду прымушан быў паслаць тэлеграму Цэнтральнай Управе Міліцыі (гэта і далейшыя вытрымкі і асобныя факты ўзяты з „вестак, якія паступілі ў Цэнтральную Ўправу Міліцыі“ і надрукаваны ў кнізе „Сялянскі Рух 1917 году“ (архіў Кастрычнікавай рэвалюцыі), што *„сяляне ў Рагачоўскім павеце вырубаюць казённыя і абшарніцкія лясы“*, а рагачоўскія абшарнікі ў тэлеграме ад 14 сакавіка гавораць, што *„сяляне рабуюць і паляць маёнткі“*. З Віцебскага павету 18 сакавіка паведамляюць, што *„сяляне

*захапілі маёнтак „Забалоцьце“ абшарніцы Сямёнавай, каля павятовага гораду Люцына“*. З Менскай губэрні абшарнік Смаргінскі 16 сакавіка паведамляе, што *„ў Холмечы сяляне вырубаюць лясы“*. Зразумела, паведамленьні ў Цэнтральную Ўправу Міліцыі ахапляюць ня ўсе выпадкі аграрнага руху. Аграрны рух ужо ў сакавіку распаўсюдзіўся вельмі шырока і паказаныя паведамленьні зьяўляюцца толькі найбольш тыповымі і масавымі.

Масавы аграрны рух у працягу ўсяго сакавіка заставаўся ў поўнай меры стыхійным. Ніводная з партый ім яшчэ ня кіруе. Ня было яшчэ зямельных камітэтаў, выканаўчых камітэтаў ці якіх-небудзь іншых арганізацый, якія маглі-б стаць на чале аграрнага руху. Арганізацыі для кіраўніцтва сялянскімі масамі пачалі ствараецца толькі ў канцы сакавіка, і толькі ў канцы сакавіка і ў пачатку красавіка можна заўважыць першыя сур'ёзныя спробы з боку гэтых арганізацый, стаць на чале сялянскага руху.

У пачатку красавіка сялянскі рух ахапіў усю сялянскую Беларусь. Дзе-ні-дзе былі яшчэ выпадкі разгрому маёнткаў (Аршанскі, Слуцкі, Дзісьненскі паветы і г. д.), але асноўнымі формамі сялянскага руху зьяўляліся захопы абшарніцкіх зямель для засеву сялянамі (паведамленьне земляўласьнікаў Чэрыкаўскага павету ад 23 красавіка, заява ўласьніцы маёнтку Дзекан, Сененскага павету, афіцыйнае паведамленьне аб становішчы ў Мазырскім, Бабруйскім, Менскім, Навагрудзкім і Ігуменскім паветах), прыпыненьне вырубаньня лесу абшарнікамі, у некаторых выпадках самавольна сялянамі, у іншых выпадках шляхам ператварэньня валасных камітэтаў у цэнтральныя органы ўлады з прыпыненьнем вырубаньня да атрыманьня растлумачэньняў (Малявічы, Рагачэўскага павету; маёнтак Дзекан, Сененскага павету; Мазырскі павет, маёнтак Рафалава, Іодскай воласьці, Дзісьненскага павету, маёнтак „Зайнава“ і „Вымск“, Сьвятаполк-Мірскага таго-ж павету і г. д.), частковы разгром маемасьці земляўласьнікаў (Аршанскі, Мазырскі, Бабруйскі, Менскі, Навагрудзкі і Ігуменскі паветы), арышт найбольш энэргічных абшарнікаў і раззброеньне іх (Слуцкі, Лепельскі і Дзісьненскі паветы і г. д.).

Такім чынам, рух пашыраецца, але ў ім элемэнты барацьбы за поўную ліквідацыю абшарніцкага земляўладаньня зьмяншаюцца, а перавагу маюць мерапрыемствы, накіраваныя да абмежаваньня абшарніцкага земляўладаньня, да частковага захопу зямель, сенажаці, лясоў, да ліквідацыі выключнага права абшарнікаў на лоўлю рыбы ва ўнутраных водах і г. д. Гэта таму, што ў красавіку на чале аграрнага руху ўжо сталі эсэраўскія павятовыя выканаўчыя камітэты сялянскіх дэпутатаў, і шырокія сеткі эсэраўскіх арганізацый у вёсцы, якія ўжо ў гэты час, хоць і пры вялікім супраціўленьні нізоў, вядуць лінію на абмежаваньне і легалізацыю руху, накіроўваючы яго ў законныя рамкі, не дапускаючы захопу ўсёй абшарніцкай зямлі і ліквідацыі абшарніцкіх гаспадарак. Бальшавіцкія арганізацыі яшчэ не карыстаюцца належным уплывам для таго, каб у вёсцы ставіць пытаньне аб паглыбленьні і пашырэньні аграрнага руху. У першым сялянскім выканаўчым камітэце Менскай губэрні, у якім нейкі час старшынстваваў т. Фрунзэ, перавагу мае эсэраўскі настрой і курс на затрыманьне і самаабмежаваньне аграрнага руху, на адкладаньне вырашэньня пытаньня аб усёй зямлі да ўстаноўчага збору, эсэры гасяць такім чынам сялянскае паўстаньне размовамі аб дэмакратыі, устаноўчым зборы і недапушчальнасьці самачынства. Аднак у гэты час эсэраўскія масы ўжо ў шмат якіх мясцох ідуць далей вярхоў, а ў шмат мясцох эсэрам не ўдаецца ўтрымацца на размовах і частковых захопах абшарніцкіх зямель. Надыходзіць вясна, селяніну патрэбна зямля зараз, а не пасьля ўстаноўчага збору, для засеву, патрэбна зараз паша

і сенажаць. Таму эсэраўскае затрыманьне мае малы посьпех і рух распаўсюджваецца. Эсэраўская партыя, якая зрабілася масавай сялянскай партыяй, ня можа ня быць на чале гэтага руху. Эсэраўскія агітатары заклікаюць да частковага захопу абшарніцкіх зямель і засеву сялянамі, да перашкоды вырубаньня абшарніцкіх лясоў, да разьдзелу жывёлы, арышту асобных кіраўнікоў і абшарнікаў. Адначасова яны ўгаварваюць сялян, што пытаньне аб зямлі канчаткова будзе вырашана ўстаноўчым зборам.

Рух, аднак, уздымаецца і ў канцы мая дасягае найвышэйшага напружаньня за ўвесь веснавы пэрыяд.

Падамо некалькі паведамленьняў абшарнікаў, характарызуючых гэты рух. Абшарнік Масальскі тэлеграфаваў 9 мая ў Цэнтральную Управу Міліцыі: *„У Клімавіцкім і Чэрыкаўскім паветах сяляне пад уплывам узбуджаючых прамоў прыяжджаючых з злым намерам асоб твораць самачынствы і гвалты; не даюць засяваць палі, труцяць палі, робяць вобыскі і пагражаюць расправай з земляўласьнікамі; у маёнтку Л. Масальскага адабраны пры вобыску паляўнічыя стрэльбы і рэвальвэры"*. Павятовая ўлада, у той-жа самы час, пасылае супакойваючыя тэлеграмы, адхіляючы існаваньне аграрнага руху. Паведамленьне ў Галоўную Управу Міліцыі ад таго-ж 9 мая гаворыць аб тым, што *„ў Чэрыкаўскім павеце арганізуюцца плянамерныя сельскія работы, выступленьняў на глебе аграрных патрабаваньняў няма, пасьпешна праводзіцца харчовая справа"*.

Пасьля ўтварэньня кааліцыйнага ўраду эсэры ўвесь свой аўтарытэт кідаюць на абарону ўлады часовага ўраду і кааліцыі, мясцовыя эсэраўскія арганізацыі павінны цалкам падтрымліваць зямельную палітыку часовага ўраду, які ня можа і ня хоча рваць з ліберальнымі абшарнікамі. Гэтым эсэры пачынаюць траціць кіраўніцтва рухам. Ужо ў канцы месяца пачынаюцца значныя разыходжаньні між цэнтральнай і мясцовай уладай. 12 мая адсылаецца афіцыйнае паведамленьне, што *„хоць у Быхаўскім і Чэрыкаўскім паветах буйных аграрных выступленьняў ня было, але ў большасьці валасьцей часта бываюць выпадкі самачыннай дзейнасьці як з боку асобных сялян, так і з боку валасных выканаўчых камітэтаў"*.

Кіруемыя эсэрамі нізавыя арганізацыі знаходзяцца пад моцным уціскам стыхійнага масавага руху. Пад уціскам патрабаваньня сялян і бальшавікоў, удзельнікаў зьезду, Менскі сялянскі зьезд ухваляе рэзалюцыю аб дапушчэньні бясплатнай пашы жывёлы ў казённых, прыватных і сялянскіх лясох і на незасеяных палёх. Некаторыя мясцовыя эсэраўскія выканаўчыя камітэты прабуюць абмежаваць гэтыя рэвалюцыйныя правы сялян. Бабруйскі выканаўчы камітэт, прымаючы гэту пастанову зьезду, дае загад, што гэта дзейнасьць сялян павінна дапушчацца толькі з дазволу павятовага выканаўчага камітэту. Аднак, сялянскія масы ідуць далей згодніцкіх выканаўчых камітэтаў і ў тым самым Бабруйскім павеце, ня гледзячы на пастанову выканаўчага камітэту і загады павятовага камісара, не перешкаджаць вырубцы леса абшарнікамі, сяляне спыняюць выруб лесу (у маёнтку Манкевіч і інш.). Рэчыцкі сялянскі зьезд, які адбыўся 21-23 мая для таго, каб затрымаць і ўвесьці ў норму сялянскі рух, пастанаўляе рэквізаваць тры чвэрці наяўнасьці жывёлы па цэнах першай рэквізіцыі, прадаставіць сялянам пляменную жывёлу абшарнікаў, замяніўшы яе сваёй і даплаціўшы розьніцу ў вазе. Валасныя камітэты прымаюць гэтую пастанову да выкананьня, але на справе ідуць значна далей. У некаторых мясцовасьцях сяляне не задавальняюцца чыннасьцю павятовых і валасных выканкомаў, пераабіраюць гэтыя камітэты, а часамі выбіраюць спэцыяльныя камітэты для кіраўніцтва выру-

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

бам лясоў і захопам сенажаці на абшарніцкіх землях. У Слуцкім павеце, ня гледзячы на апартунісцкія пастановы павятовага выканаўчага камітэту, сяляне на чале з сельскімі і валаснымі камітэтамі вырубаюць лясы, захапляюць палі і пашы звыш нормы, дазволенай выканаўчым камітэтам. У некаторых мясцовасьцях, пад кіраўніцтвам салдат, адбываюцца разгромы абшарніцкіх маёнткаў, забіраюць абшарніцкія насенныя фонды і інвэнтар. Мясцовая ўлада, якая працуе сумесна з эсэраўскімі арганізацыямі і пад іх кіраўніцтвам, ня можа ўвесьці рух у „законныя“ рамкі.

Аўтарытэт мясцовых эсэраўскіх арганізацый пачынае падаць. Менскі губэрскі камісар часовага ўраду пасылае тэлеграму ў Петраград, што ён лічыць неабходным для ўпарадкаваньня інцыдэнтаў умяшацельства Петраградзкага савету сялянскіх дэпутатаў, як найбольш аўтарытэтнай арганізацыі.

З гэтых паведамленьняў відаць, што ў маі сялянскі рух пачынае перарастаць эсэраўскую верхавіну і паўстае супроць часовага ўраду. Толькі вялізарнымі стараньнямі эсэраў і іх супольнікаў удаецца стрымаць рух у „законных“ рамках, дазволеных партыяй кааліцыйнага ўраду. Толькі вялізарнымі стараньнямі эсэраў удаецца пераканаць сялян у неабходнасьці чакаць загаду часовага ўраду. Зьвязаўшы пытаньне аб далейшым разгортваньні аграрнай рэвалюцыі з пытаньнем аб уладзе, у якой яны бяруць удзел, эсэры, не зважаючы сялян сваёй практыкай праўдзеньня аграрнай рэвалюцыі, ужо ў канцы мая пачынаюць узбуджаць сялян супроць сябе і ўраду. Сялянскія сходы ахвотна ўхваляюць пастановы аб падтрыманьні часовага ўраду, але дадаюць да іх свае аграрныя патрабаваньні, якія ідуць у разрэз з лініяй часовага ўраду. Сялянскі рух ня можа здаволіцца дазволенымі эсэраўскай партыяй і часовым урадам рамкамі і ідзе далей. Сялянскі рух перарастае эсэраўшчыну і пачынае схіляцца да бальшавізму. Эсэраўскі ўплыў утрымліваецца толькі тым, што час засеву падыходзіць да канца, што разам з тым патрабаваньне аб неадкладным захопе зямлі траціць сваю вострасьць, што пасьля веснавых засеваў селянін можа чакаць з захопам зямлі. Масавасьць аграрнага руху, аднак, не зьмяншаецца. Замест пытаньня аб захопе зямлі і абшарніцкага інвэнтару галоўную ролю пачынае адыгрываць пытаньне аб сенажаці, пашы і як і раней—аб лясох. Чэрвень—месяц сенакосу дае шырокі рух сялян за захоп абшарніцкіх сенажацяй. Валасныя і павятовыя зямельныя камітэты прабуюць увесьці гэты рух у рамкі шляхам пастаноў аб ільготнай арэндзе абшарніцкіх сенажацяй сялянамі.

С полным текстом документа можно ознакомиться в библиотеке